**ЗАРЭЧЧА** — вёска ў Баронькаўскім сельскім Савеце, за 40 км на ПдЗ ад Касцюковіч, 33 км ад чыгуначнай станцыі Бялынкавічы на лініі Крычаў—Сураж, 200 км ад Магілёва, на р. Бесядзь (прыток р. Сож), на поўначы і поўдні мяжуе з лесам. Транспартныя сувязі па прасёлачнай і далей па аўтадарозе Клімавічы—Сураж.

Заснавана ў 1920-х г. перасяленцамі з суседніх вёсак на былых памешчыцкіх землях. З сакавіка 1924 г. у БССР, з 17.07.1924 г. у Бялынкавіцкім, з 04.08.1927 г. ў Касцюковіцкім раёнах. У Вялікую Айчынную вайну 30.09.1943 г. вызвалена ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Паводле перапісу 1959 г. — 227, у 1970 г. – 162 жыхары. У 1986 г. – 32 гаспадаркі, 70 жыхароў, у складзе саўгаса «Зарэчны» (цэнтр — в. Вялікі Бор), меўся магазін. Забудова пераважна аднабаковая, драўляная, сядзібнага тыпу. Побач залежы мелу.

У сувязі з радыяцыйнай забруджанасцю пасля чарнобыльскай катастрофы жыхары (32 сям’і) перaселены ў чыстыя мясцовасці.